# Адказы на заданні рубрыкі «Гэта цікава!»

**Занятк і 1.** Можна, але пры наступнай умове: калі на займеннік-дзейнік падае лагічны націск (павышэнне голасу і вялікая паўза пасля слова).

**Заняткі 2.** *Хто ходзіць зранку на чатырох нагах, днём — на дзвюх, а вечарам — на трох нагах?* (Чалавек у розным узросце.)

**Заняткі 3.** Азначэнні не з'яўляюцца аднароднымі, бо характарызуюць прадмет з розных бакоў, выражаны якасным і адноснымі прыметнікамі, не злучаюцца інтанацыяй пералічэння, паміж азначэннямі нельга ўставіць злучнік ***і***, паміж імі не стаяць коскі.

**Заняткі 4.** Аднародныя члены звязаны адзіночнымі, а не паўторнымі злучнікамі. Першы злучнік ***і*** звязвае аднародныя дзейнікі ***прыказкі*** і ***прымаўкі***, другі — аднародныя выказнікі ***карыстаюцца*** і ***з'яўляюцца***. Таму знакі прыпынку ў сказе ставіць не трэба.

**Заняткі 5.** Аднародныя члены з абагульняльным словам ёсць у сказе пад нумарам 1.

*Манеты і посуд, рэшткі будынкаў і берасцяныя граматы — усё гэта знаходзяць вучоныя пры раскопках.*
О і О, О і О — О.

**Заняткі 6.** Коску пасля ***о*** ставіць не трэба, бо ў сказе ***о*** — гэта часціца, а часціцы, якія стаяць перад зваротками, ад іх коскай не аддзяляюцца.

Спампавана з сайта aversev.by

**Заняткі 7.** Знакі прыпынку ў сказе расстаўлены правільна, бо ***відаць*** — гэта пабочнае слова.

У гэтым сказе можна не ставіць знакі прыпынку. Калі інтанацыйна не выдзяляць слова ***відаць***, тады яно будзе выказнікам.

**Заняткі 8.** У вершы Я. Сіпакова ўстаўныя канструкцыі ўносяць у сказ, у які яны ўключаны, дадатковую заўвагу пра падабенства дрэў і людзей.

*Псіхалагічны паралелізм* — гэта стылістычны прыём, сутнасць якога заключаецца ў супастаўленні з'яў прыроды і чалавечых учынкаў і адносін.

**Заняткі 9.**

Узмакрэлы і босы,
Бронзавы ад загару,
Стомлены сенакосам,
Ліпень прылёг памарыць.
Мёдам на ўсю Еўропу
Пахнуць стагі і копы.

Стварыць «маштабны паэтычны малюнак» А. Пісьмянкову дазволіў такі мастацкі прыём, як *увасабленне* (*персаніфікацыя*).

**Заняткі 10.** Імшарніца і аер — розныя расліны, а імшарніца і андрамеда — розныя назвы адной і той жа расліны.

У першым сказе ***імшарніцай або аерам*** — аднародныя дапаўненні, звязаныя адзіночным злучнікам ***або***, таму коска не ставіцца. У другім сказе ***або андрамедай*** — адасоблены прыдатак, які па правіле выдзяляецца коскай.

Спампавана з сайта aversev.by

**Занятки 11.** Варыянт адказу: *У нядзелю ўся сям'я, /акрамя мяне/, выправілася на экскурсію.*

**Занятки 12.** *Дзяўчына загаварыла павольна, /думаючы над кожным словам/. — Дзяўчына загаварыла, /павольна думаючы над кожным словам/.*

**Занятки 13.** У сказе *Ноччу нечакана падняўся моцны вецер* няма ўдакладняльнай акалічнасці, бо акалічнасць ***ноччу*** адказвае на пытанне *калі?*, а акалічнасць ***нечакана*** — на пытанне *як?*.

У сказе *Ноччу, гадзіны ў тры, ён пачуў званок у дзверы **гадзіны ў тры*** — удакладняльная акалічнасць, якая звужае значэнне акалічнасці ***ноччу***, таму яна выдзяляецца коскамі.

**Занятки 14.**

...А мужчыны, **як скалы,** — ударыш, і зломіцца меч.
...Дзе жанчыны, **як радасны сон у стагах на зары,**
А дзяўчаты, **як дождж залаты**. А сівыя матулі,
**Як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары**.

У гэтых сказах па правіле параўнальныя звароты не выдзяляюцца (коску перад ***як*** ставіць не трэба), бо з'яўляюцца выказнікамі.

Спампавана з сайта aversev.by